УДК 7.031:745/749

# НАРОДНЫ ВЫЯЎЛЕНЧЫ ПРЫМІТЫЎ І ЯГО РАЗВІЦЦЁ Ў СУЧАСНАЙ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ

***Р. Ф. Шаура,*** *доктар мастацтвазнаўства, прафесар, загадчык кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя:** У артыкуле актуалізаваны пытанні, якія адносяцца да праблемы выяўленчага прымітыву і яго месца ў параўнанні з прафесійным і традыцыйным народным мастацтвам. Аўтар сцвярджае, што наіўнае мастацтва не з’яўляецца асобным кірункам у культурным працэсе, а існуе на глебе традыцыйнай творчасці, хаця і мае спецыфічную тыповасць вобразнага і зместавага вытлумачэння.

**Ключавыя словы:** выяўленчы прымітыў, прафесійнае мастацтва, традыцыйная творчасць, мастацкі вобраз, кампазіцыя, генетычная перадача мастацкага кода.

# FOLK PICTORIAL PRIMITIVE AND ITS DEVELOPMENT IN CONTEMPORARY ART

***R. Shaura,*** *Doctor of Art History, Professor, Head of the Department of Decorative and Applied Arts of the Educational Institution «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article actualizes the issues related to the problem of the pictorial primitive and its place in comparison with professional and traditional folk art. The author argues that naive art is not a separate direction in the cultural process, but exists on the basis of traditional creativity, although it has its specific typicality of figurative and meaningful interpretation.

**Keywords:** visual primitive, professional art, traditional creativity, artistic image, composition, genetic transmission of the artistic code.

Паняцце «прымітыў» выкарыстоўваецца ў самых розных сэнсах і, у першую чаргу, як вызначэнне першаснага, архаічнага ў мастацтве. У мастацкай культуры і ў мінулыя часы існавала мноства жывапісных,

графічных і скульптурных работ, якія не адпавядалі строгім патрабаванням акадэмічнай мастацкай школы і ў той жа час не з’яўляліся народнымі ў традыцыйным, сялянскім уяўленні іх існавання і развіцця. Гэта месца займаў выяўленчы прымітыў, які не саступаў па сваіх дасягненнях высокаму і сялянскаму бытавому мастацтву.

У мастацтвазнаўчай літаратуры тэрмін «прымітыў» выкарыстоўваецца ў якасці паняццяў «наіў», «наіўнае мастацтва», «наіўны мастак». Дадзенае тэрміналагічнае вызначэнне ўвайшло ў навуковае абарачэнне еўрапейскага мастацтвазнаўства ў сярэдзіне XX ст.

У слоўніках рускай мовы слова «наіўны» тлумачыцца як «прастадушны», «недасведчаны», «просты, непасрэдны». Усходнееўрапейскія навукоўцы ў пошуках больш дакладнага вызначэння гэтай з’явы мастацтва ўзялі за аснову лацінскі тэрмін «insitus, insita», які азначае «прыроджаны». Наіўнае мастацтва ў сучасных умовах яго камунікацыі можа мець падабенства з сумежнымі тыпамі мастацкай культуры, але змяшчаюць іншую ўнутраную прыроду. Гэта ўяўнае падабенства матывуецца тым, што наіў як спецыфічная мастацкая сістэма ў панараме сучаснай культуры знаходзіцца на скрыжаванні шматлікіх культурных утварэнняў, якія, узаемадзейнічаючы паміж сабой, адчуваюць уплыў кожнай мадэлі творчасці.

У адрозненне ад мастацтва першабытнай эпохі, у якой пераважала калектыўная форма мастацкай думкі, сучасны выяўленчы прымітыў прадстаўляе сабой феномен індывідуальнага творчага пачатку. Ён не атаясамляецца з фальклорам і традыцыйным народным дэкаратыўным мастацтвам. Феномен выяўленчага прымітыву ўзнікае ва ўмовах творчай дзейнасці таленавітай асобы, якая імкнецца адлюстраваць свет спецыфічнымі мастацкімі сродкамі, закадзіраванымі ў яе свядомасці прыродай і не маючымі непасрэдных адносін да сістэмы акадэмічных мастацкіх правілаў і прыёмаў.

У аснове прымітыву ляжыць прымат рэалізацыі ўнутранай патрэбы мастака ў спантаннай творчай дзейнасці без рэфлексій і карэктываў, сканцэнтраваных на асобасных ураджаннях і прыроджаным мастацкім інстынкце. Наіўнае мастацтва (прымітыў) развіваецца па-за межамі прафесійнай школы і агульнапрынятых выяўленчых выразных сродкаў. Наіўны мастак у сваёй працы заўсёды адлюстроўвае тое, што ён ведае, што асацыюецца з яго прадстаўленнямі аб прадметным свеце. Ён імкнецца аперыраваць пэўнымі стэрэатыпамі вобразаў, якія маюць нейкую тыповасць у спецыфіцы адлюстраваных прадметаў, сцэн і сюжэтаў, ва ўстойлівасці кампазіцыйных схем і архетыпаў. Наіўнае мастацтва не звязана з мастацкімі традыцыямі, характэрнымі для народнай традыцыйнай творчасці. Аднак у наіўным мастацтве існуюць свае спецыфічныя традыцыі, але яны не маюць падабенства з калектыўнай формай перадачы выпрацаванага кода мастацтва, а

выражающца праз устойлівыя вобразныя мадэлі падсвядомага, генетычна закладзенага ў чалавеку своеасаблівага мастацкага бачання рэальнага быцця.

Часта праца наіўных мастакоў кваліфікуецца толькі як катэгорыя непрафесійнага мастацтва, і вызначальным фактарам іх ацэнкі з'яўляецца знешняя форма твораў – іх неадпаведнасць крытэрыям акадэмічнай школы. Аднак адсутнасць ведаў прафесійнай школы не з'яўляецца паказчыкам прызначэння таго ці іншага твора да наіўнага мастацтва, да прымітыву. В. А. Памешчыкаў: «Адметная асаблівасць наіўнага мастацтва не ў тварэннях мастака, а ў яго свядомасці. Карціна і свет, намаляваныя на ёй, адчуваецца аўтарам як рэальнасць, у якой ён існуе сам» [3, с. 158–159].

Шырока распаспаўсюджанай формулай для мастацтва наіўных творцаў з'яўляецца вобраз свята як самы ўрачысты і запамінальны момант у жыццёвых абставінах. Тут увага акцэнтуецца на жаданні мастака занатаваць тое агульнае, што складае галоўны кантэкст карціны – урачыстасць, узвышанасць настрою, радасць, жыццесцвярджэнне, чалавечае адзінства.

Дастаткова актуальнай у наіўнай творчасці застаецца тэма рая. Менавіта тут мадэлююцца вобразы архаічных міфаў, карціны нерэальнага сусвету, якія асэнсоўваюцца аўтарам як вобразы пэўнай сістэмы быцця, не зямнога, але і не касмічнага, а часам аднаго і другога ў адзіным узаемаперапляценні. Наіўны мастак прасякнуты верай у свае планы, фантазіі, мары, калі раскрывае перад сабой свет, які ўзнікае на палатне з небыцця, і надае жыццёвай рэальнасці новы сэнс.

Галоўнай мэтай творчай дзейнасці наіўнага мастака з'яўляецца аўтарскі самавыраз. Мастак па-свойму рэфлексуе галоўную сутнасць творчага працэсу, у ім спантанна праяўляюцца эмоцыі і рэалізуецца спроба данесці свае думкі да гледача сродкамі вобразнай выяўленчай мовы. Наіўнае мастацтва ўзнікае і развіваецца ў розных сацыяльных умовах, і ў яго каштоўнаснай ацэнцы ёсць рознае кола прыхільнікаў. Яно заснавана на адзінай прыродатворчай энергетыцы, якая генетычна перадаецца чалавеку і захоўваецца падсвядома ў закадзіраваных «праграмах» мастацкага адлюстравання рэальнасці.

У шматлікіх практыкаў і мастацтвазнаўцаў неадназначныя адносіны да ацэнкі выяўленчага прымітыву і яго класіфікацыі як па гістарычных перыядах функцыянавання, так і па вобразнастылістычных асаблівасцях. Некаторыя тэарэтыкі выключаюць прымітыў з сістэмы народнага мастацтва і разглядаюць яго як з'яву асобнай культуры (А. Концэдыкас), іншыя пад тэрмінам «прымітыў» маюць на ўвазе спрашчэнне, стылістычную аморфнасць, змешванне ўмоўнага канона з натуралістычнасцю і самадзейным праўдападабенствам. (А. Гарпенка). У іншай пласкасці праводзіць параўнанне прымітыва і самадзейнай

выяўленчай творчасці вядомы даследчык народнага мастацтва М. А. Някрасава: «Народны прымітыў звязаны з культурай народнай, прымітывізм у станковым мастацтве ўзнікае на глебе культуры прафесійна-мастацкай. І тое, і другое вызначаецца вядомай псіхалагічнай структурай» [2, с. 100]. У гэтым выпадку навуковец адносіць выяўленчы прымітыў толькі да сферы сялянскай дэкаратыўна-прыкладной творчасці, але не з п. гл. выяўленчых формаў яго праяўлення. Прымітыў у народным мастацтве хоць і ўзнікае на глебе асаблівасці індывіда і вызначаецца яго псіхалагічнай структурай, усё ж вырастае і развіваецца ў межах народнага мастацтва і наўрад ці можа быць аднесены да якога-небудзь іншага вымярэння культуры. На сучасным этапе навуковага асэнсавання праблемы выяўленчага прымітыву шэраг навукоўцаў пацвярджае ідэю, што прымітыў і наіўнае мастацтва як яго прыватная праява з'яўляюцца неад'емнай часткай народнага мастацтва, якое ўзнікла і развіваецца ў акрэсліных межах. Е. І. Кірычэнка, напрыклад, тлумачыць, што «...на генетычным узроўні значная колькасць наіўных мастакоў – носьбіты арыгінальнай народнай традыцыі, якія пачынаюцца з сялянскага мастацтва, аднак ў XX ст. пад уплывам сацыякультурных фактараў у народным мастацтве адбыліся некаторыя змены, у т. л. сфарміраваныя гарадскім асяроддзем» [1, с. 76]. Сапраўды, народны прымітыў і асабліва яго выяўленчыя формы паранейшаму з'яўляюцца даволі складанай праблемай у тэорыі мастацтва. Існуе мноства пунктаў гледжання навукоўцаў, тэарэтыкаў мастацтва, практыкаў на дадзенае культурнае ўтварэнне. Такія пытанні ўсё часцей становяцца актуальнымі на міжнародных семінарах і канферэнцыях. Інтэлектуальная супольнасць імкнецца вызначыць яе сутнасць, спецыфіку, ролю і месца не толькі ў духоўнай культуры, але і ў жыцці грамадства ў цэлым.

Прымітыў, які займае месца паміж фальклорам і прафесійным мастацтвам, не з'яўляецца самастойным стылістычным кірункам у галіне мастацтва. Ён функцыянуе ў межах фальклору і арыентуецца на ўзоры прафесійнага мастацтва. Але прымітыў мае дастаткова аддаленыя адносіны да прафесійнага мастацтва, бо ў сваёй аснове ён выключае школу акадэмічнай мастацкай падрыхтоўкі. Адзінае, што можна знайсці ў гэтых сувязях, гэта тое, што прымітыў часта запазычвае ў прафесійнага мастацтва некаторыя тэмы і сюжэты, але тут яны трансфармуюцца ў зусім іншую мову мастацкага вытлумачэння.

Л. І. Тананаева адзначае: «Для таго, каб адчуваць канкрэтную каштоўнасць "прымітыву" як твора мастацтва, неабходна пераадолець звычку шукаць сапраўдныя мастацкія каштоўнасці толькі на "правільных" шляхах яго развіцця» [4, с. 109]. Як вядома, прываблівая моц мастацкага вобраза не можа залежыць ад акадэмічнай правільнасці арганізацыі кампазіцыйнай структуры, каларыстычнага рашэння

жывапіснага твора альбо дакладнасці прапорцый у аб'ёмнай пластыцы. Кожны кірунак у мастацтве развіваецца ў рамках сваёй стылістычнай сістэмы з адпаведным арсеналам мастацкіх умоўнасцей. Прымітыў як асаблівы тып мастацкага мыслення прадстаўляе сабой найбольш спецыфічныя і адносна ўстойлівыя кампазіцыйныя схемы, якія маюць стылістыку, характэрную для народнага светапрадстаўлення. Мастацкі вобраз у творах наіўнага жывапісу, графікі ці скульптуры не наіўны з п. гл. мастацкай значнасці. Ён складаны, своеасаблівы, але заўсёды вызначае цэласнасць прадметнага бачання, прастадушнае абаянне, змястоўнасць. У ім прадметы і ідэі злучаюцца ў спецыфічную мастацкую форму, падуладную толькі асобаснаму эстэтычнаму прадстаўленню аўтара.

1. *Кириченко, Е. И.* Художественный мир наивной живописи России второй половины XX века : дис. ... канд. искусствоведения : 17.00.04 / Е. И. Кириченко. – Екатеринбург, 2004. – 384 с.

2. *Некрасова, М. А.* Народное искусство как часть культуры. Теория и практика / М. А. Некрасова. – М. : Искусство, 1983. – 343 с.

3. *Помещиков, В. А.* Роль архетипов в наивном искусстве / В. А. Помещиков // Примитив в изобразительном искусстве : материалы науч. конф., Москва, 14–15 мая 1995 г. / Третьяков. галерея ; отв. ред. А. В. Лебедев. – М., 1997. – С. 158–159.

4. *Тананаева, Л. И.* Польский портрет XVII–XVIII веков: к вопросу о «примитивных» формах в искусстве Нового времени / Л. И. Тананаева // Совет. искусствознание, 77 / редкол. : В. М. Полевой [и др.]. – М., 1978. – Вып. 1. – С. 100–129.

***Малюнкі да артыкула***



*Мал. 1.* Г. Асіпкова. «Песня» (разьба па дрэве) (крыніца: Шаура, Р. Ф. Самадзейнае выяўленчае мастацтва Беларусі. 1995. С. 232)



*Мал. 2.* А. Маісеева. «Каляды. Гульні» (крыніца: Маісеева, А. Жыццё ў карцінках. 2020. С. 30)